Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
________________А. А. Корбут
«___» _________________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МУЗЕІ СВЕТУ
## Раздзел 2. МУЗЕІ БЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**
*І. Н. Колабава*, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Л. У. Дамнянкова*, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук;
*М. М. Елінская*, кансультант аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 26.11.2015 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 21.12.2015 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: І. Н. Колабава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Музейная сетка Беларусі мае трывалыя традыцыі, якія сфарміраваліся яшчэ ў папярэднія стагоддзі. Станаўленне і дзейнасць музеяў цесна звязана з асаблівасцямі гістарычнага працэсу, што разгортваўся на беларускіх землях. Роля музейных устаноў у развіцці сучаснага грамадства не абмяжоўваецца толькі рамкамі культурнага развіцця краіны, а выходзіць далёка за іх межы. Авалоданне тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі ў рэчышчы вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» робяць яе надзвычай актуальнай у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Музеі свету. Раздзел 2. Музеі Беларусі» прызначана для студэнтаў спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)».

Вучэбная дысцыпліна «Музеі Беларусі» непасрэдна звязана з шэрагам музеязнаўчых («Гісторыя музейнай справы», «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» і інш.), агульнагістарычных і спецыяльных гістарычных вучэбных дысцыплін («Гісторыя Беларусі», «Нумізматыка», «Фалерыстыка», «Геральдыка» і інш.).

Прадметам вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» з’яўляюцца праблематыка гісторыі развіцця музейнай справы ў Беларусі, працэс фарміравання музейнай сеткі краіны, зборы дзяржаўных і прыватных музеяў Беларусі, дзяржаўная музейная палітыка, асноўныя кірункі дзейнасці і перспектывы развіцця беларускіх музеяў, музейныя арганізацыі і нацыянальнае музейнае заканадаўства.

Вызначальнай *мэтай* выкладання дысцыпліны з’яўляецца вывучэнне студэнтамі сучаснага стану і перспектыў далейшай дзейнасці беларускіх музеяў.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» прадугледжвае вырашэнне шэрагу *задач:*

– выявіць асноўныя арганізацыі, якія займаюцца распрацоўкай музейнай праблематыкі на дзяржаўным узроўні;

– разгледзець айчынную практыку падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю станаўлення і развіцця беларускіх музеяў;

– выявіць характэрныя асаблівасці арганізацыі музейнай справы і сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусі;

– вызначыць уплыў сацыяльна-эканамічнага, унутрыпалітычнага і культурнага развіцця на сучасны стан і дзейнасць музеяў Беларусі.

У выніку вывучэння курса студэнты павінны *ведаць*:

– асноўныя этапы развіцця музейнага будаўніцтва ў Беларусі;

– асноўныя кірункі дзяржаўнай музейнай палітыкі;

– структуру рэспубліканскай музейнай сеткі Беларусі;

– сучасны стан музеяў і музейнай справы Беларусі;

– асноўныя кірункі і дасягненні ў музейным будаўніцтве на сучасным этапе;

– калекцыі рэспубліканскага музейнага фонду;

– ролю музеяў у развіцці культуры краіны.

Студэнты павінны *ўмець*:

– аналізаваць крыніцы і літаратуру па гісторыі музейнага будаўніцтва ў Беларусі;

– даць характарыстыку беларускай музейнай сеткі;

– аналізаваць гісторыю стварэння і вопыт дзейнасці асобных музеяў, склад іх калекцый;

– вызначаць месца і ролю музеяў у культурным жыцці асобных рэгіёнаў.

Студэнты павінны *валодаць:*

– прафесійнымі навыкамі па аналізе і выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў музеяў Беларусі;

– стварэннем інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме курса;

– навыкамі музейнай кампаратывістыкі.

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі іншых музеязнаўчых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства («Гісторыя музейнай справы», «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны», «Тэорыя і гісторыя культуры» і інш.).

Актывізацыі самастойнай работы студэнтаў у кірунку пошуку і выкарыстання ведаў, атрымання самастойнага вопыту вырашэння задач садзейнічаюць такія дзейсныя педагагічныя методыкі і тэхналогіі, як:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– гісторыка-тэматычны падыход;

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.);

– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Усяго па вучэбнай дысцыпліне вучэбным планам прадугледжана 100 гадзін, з іх 38 – аўдыторных (20 – лекцыйных, 18 – семінарскіх).

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца студэнтамі на III курсе ў форме лекцыйных і семінарскіх заняткаў. Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінарскія заняткі |
| Уводзіны | 4 | 4 | |
| **Раздзел I. Дзяржаўныя музеі г. Мінска і Мінскай вобл.** | | | |
| *Тэма 1.* Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Літаратурныя музеі г. Мінска | 2 | 2 | |
| *Тэма 4.* Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту. Музеі-запаведнікі | 2 | 2 | |
| *Тэма 5.* Музеі г. Мінска (знаёмства з музеямі горада) | 6 | | 6 |
| *Тэма 6.* Мінскі абласны краязнаўчы музей (г. Маладзечна) | 1 | 1 | |
| *Тэма 7.* Раённыя музеі Мінскай вобл. | 2 | | 2 |
| **Раздзел II. Дзяржаўныя музеі Брэсцкай вобл.** | | | |
| *Тэма 8.* Брэсцкі абласны краязнаўчы музей | 1 | 1 | |
| *Тэма 9.* Раённыя музеі Брэсцкай вобл. | 2 | | 2 |
| **Раздзел III. Дзяржаўныя музеі Віцебскай вобл.** | | | |
| *Тэма 10.* Віцебскі абласны краязнаўчы музей | 2 | 2 | |
| *Тэма 11.* Раённыя музеі Віцебскай вобл. | 2 | | 2 |
| **Раздзел IV. Дзяржаўныя музеі Гомельскай вобл.** | | | |
| *Тэма 12.* Гомельскі палацава-паркавы ансамбль | 2 | 2 | |
| *Тэма 13.* Раённыя музеі Гомельскай вобл. | 2 | | 2 |
| **Раздзел V. Дзяржаўныя музеі Гродзенскай вобл.** | | | |
| *Тэма 14.* Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей | 1 | 1 | |
| *Тэма 15.* Раённыя музеі Гродзенскай вобл. | 2 | | 2 |
| **Раздзел VI. Дзяржаўныя музеі Магілёўскай вобл.** | | | |
| *Тэма 16.* Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава | 1 | 1 | |
| *Тэма 17.* Раённыя музеі Магілёўскай вобл. | 2 | | 2 |
| **Разам…** | **38** | **20** | **18** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў Беларусі (1918–2015).

Агульная характарыстыка музейнай сеткі Беларусі.

Заканадаўчая база дзейнасці музеяў Беларусі. Закон «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (2011).

Музейная адукацыя. Міжнароднае музейнае супрацоўніцтва.

## Раздзел І. Дзяржаўныя музеі г. Мінска і Мінскай вобл.

### *Тэма 1. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусі*

Этапы гісторыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Пастанова Часовага рабоча-сялянскага ўрада ў Мінску аб стварэнні Абласнога музея (20.01.1919). Структура музея. Страты музея падчас савецка-польскай вайны (1919–1920).

Беларускі дзяржаўны музей (БДМ) (1923). Аддзелы музея. Дзейнасць П. В. Харламповіча, В. Ю. Ластоўскага. Стварэнне аб'яднанай сеткі музеяў краіны на чале з Белдзяржмузеем (1924). Дзяржаўная палітыка беларусізацыі і яе ўздзеянне на развіццё музея. Наданне музею новай назвы – Беларускі дзяржаўны культурна-гістарычны музей (1928). Страты БДМ у канцы 1920–1930 гг. у сувязі з правядзеннем рэпрэсіўных дзеянняў у дачыненні да дзеячаў навукі і культуры краіны. Продаж на ўнутраных і міжнародных аўкцыёнах музейных каштоўнасцей. Перайменаванне БДМ у Мінскі сацыяльна-гістарычны музей (1930).

Спыненне работы БДМ у сувязі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнасць у акупіраваным Мінску Гістарычнага музея (1941–1944). Страты музея падчас вайны.

Распараджэнне СМ БССР «Аб арганізацыйнай групе па стварэнні Дзяржаўнага музея БССР» (1956). Адкрыццё Дзяржаўнага музея БССР (1967). Музейныя аддзелы. Стварэнне Савета па рэстаўрацыі і кансервацыі (1983). Дзяржаўны музей БССР – буйнейшы метадычны цэнтр па музейнай і гісторыка-краязнаўчай рабоце ў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэарганізацыя музея, змена профілю і наданне новай назвы – Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі (1992). Стварэнне новай экспазіцыі, правядзенне часовых выстаў. Работа экспазіцыйна-выставачнага, навукова-фондавага, навукова-асветніцкага аддзелаў.

Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (2011). Калекцыі музея – археалогіі, нумізматыкі, беларускага народнага строю канца XIX – пачатку XX ст., зброі XII–XX стст., рукапісных кніг XVI–XVIII стст., старадрукаў на еўрапейскіх мовах XVI–XVIII стст., паштовак канца XIX – пачатку XX ст., беларускай народнай керамікі, беларускага мастацкага шкла, музычных інструментаў і інш.

Філіялы музея (былыя і сучасныя) – Музей рамёстваў і народных промыслаў у г.п. Заслаўе /Мінскі р-н/ (1978), Музей I з'езда РСДРП /г. Мінск/ (1992), Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці / г. Мінск/ (2012), Музей гісторыі беларускага кіно /г. Мінск/ (2014), Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі /г. Мінск/ (2014), Музей прыроды і экалогіі Беларусі /г. Мінск/ (2014).

### *Тэма 2. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны*

Гісторыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнасць Рэспубліканскай камісіі па зборы дакументаў і матэрыялаў аб Вялікай Айчыннай вайне (1942). Правядзенне ў Дзяржаўным гістарычным музеі (Масква) выставы «Беларусь жыве. Беларусь змагаецца. Беларусь была і будзе савецкай» (1942/43).

Заснаванне (1943) і адкрыццё (1944) Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Першая стацыянарная экспазіцыя (1947) – асвятленне падзей Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі, вызвалення Беларусі, аднаўлення народнай гаспадаркі і культуры. Стварэнне і адкрыццё экспазіцыі ў новым будынку музея (1966).

Перабудова экспазіцыі ў 1990-х гг. – асвятленне асноўных этапаў Вялікай Айчыннай вайны, падзей 1941–1945 гг. на тэрыторыі Беларусі. Асноўныя тэмы – гісторыя беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне; падзеі на акупіраванай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрыторыі; удзел Беларусі і яе ўраджэнцаў у баях на франтах і ў тыле ворага. Спецыяльная пляцоўка з узорамі ваеннай тэхнікі і ўзбраення Чырвонай арміі часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Сучасная экспазіцыя музея.

Калекцыі музея – пісьмовых крыніц і кінафотадакументаў, баявых узнагарод, баявых сцягаў, вайсковай амуніцыі часоў Другой сусветнай вайны, партызанскіх рукапісных часопісаў і баявых лісткоў, франтавых і партызанскіх малюнкаў, самаробнай партызанскай зброі, уласных рэчаў удзельнікаў ваенных падзей і інш.

Філіялы музея (былыя і сучасныя) – Музей камсамольскага падполля /п. Обаль, Шумілінскі р-н, Віцебская вобл./ (1965), Мемарыяльны комплекс Хатынь /Лагойскі р-н, Мінская вобл./ (1969), Курган Славы Савецкай Арміі – вызваліцельніцы Беларусі /21 км шашы Мінск–Масква, Смалявіцкі р-н, Мінская вобл./ (1969), Музей баявой садружнасці беларускіх, рускіх, латышскіх і літоўскіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны /г. п. Расоны, Віцебская вобл./ (1981), Музей бітвы за Дняпро /г. Лоеў, Гомельская вобл./ (1984), Мемарыяльны комплекс «Рэспубліканскі помнік воінам-інтэрнацыяналістам» /г. Мінск/ (1996).

## *Тэма 3. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Літаратурныя музеі г. Мінска*

Гісторыя Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Адкрыццё Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР (1939). Спыненне дзейнасці і страты галерэі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Аднаўленне работы Дзяржаўнай мастацкай галерэі (1944). Адкрыццё галерэі для наведвальнікаў (1946). Стварэнне першай сталай экспазіцыі (1947). Адкрыццё новага музейнага будынка (1957). Перайменаванне Дзяржаўнай мастацкай галерэі ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР (1957). Накіраванасць музея на збор класікі айчыннага мастацтва.

Аддзелы музея. Навукова-даследчая і навукова-асветніцкая работа музея. Выставачная дзейнасць музея. Выданне музеем навуковых каталогаў. Дзейнасць А. В. Аладавай і Ю. А. Карачуна.

Наданне музею новай назвы – Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (1993).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калекцыі музея – беларускага сучаснага жывапісу і скульптуры, народнага мастацтва, старажытнабеларускай пластыкі XVI–XVIII стст., іканапісу XVI–XX стст., рускага жывапісу і скульптуры XVIII–XX стст., заходнееўрапейскага жывапісу, старадрукаў і інш.

Сучасная экспазіцыя музея.

Філіялы музея (былыя і сучасныя) – Мазырская раённая карцінная галерэя /г. Мазыр, Гомельская вобл./ (1976), Музей беларускага народнага мастацтва /в. Раўбічы Мінскага р-на/ (1977), Музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі /г. Магілёў/ (1978), Архітэктурны комплекс XVI–XVIII стст. у в. Гальшаны /Ашмянскі р-н, Гродзенская вобл./ (1983), Дом-музей Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX ст. /г. Мінск/ (1984), Палацава-паркавы комплекс XVI–XX стст. у г. п. Мір /Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл./ (1987), Музей-майстэрня З. І. Азгура /г. Мінск/ (1996).

Гісторыя Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Сварэнне Камісіі па зборы матэрыялаў літаратурнай спадчыны народнага паэта БССР Янкі Купалы (1942). Кірункі дзейнасці камісіі (збор кніг, рукапісаў, фотаздымкаў, лістоў, аўтографаў паэта, матэрыялаў, прысвечаных памяці паэта і інш.). Дзейнасць У. Ф. Луцэвіч.

Заснаванне (1944) і адкрыццё (1945) Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Навукова-даследчая дзейнасць супрацоўнікаў музея. Традыцыя правядзення штогадовага літаратурнага свята «Купалаўскія чытанні» (1946). Перавод музея са структуры АН БССР у падпарадкаванне Міністэрства культуры (1963). Стварэнне творчай групы па распрацоўцы новай экспазіцыі (1973) і яе адкрыццё (1976). Аднаўленне музейнай экспазіцыі да юбілейных дат (1982, 2002). Сучасная экспазіцыя музея.

Калекцыі музея – асабістых рэчаў Янкі Купалы, рукапісаў, прыжыццёвых выданняў, арыгіналаў фотаздымкаў паэта.

Філіялы музея – Літаратурны музей у Вязынцы /Маладзечанскі р-н, Мінская вобл./ (1945), Літаратурны музей у Ляўках /Аршанскі р-н, Віцебская вобл./ (1945), Літаратурны музей «Акопы» /Лагойскі р-н, Мінская вобл./ (1989), Літаратурны музей у в. Яхімаўшчына /Маладзечанскі р-н, Мінская вобл./ (1997).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыя Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Заснаванне (1956) і адкрыццё (1959) Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў мемарыяльным будынку ў Мінску. Дзейнасць Д. К. Міцкевіча. Навукова-даследчая работа супрацоўнікаў музея. Выданне зборнікаў артыкулаў, успамінаў, бібліяграфічных даведнікаў. Перавод музея са структуры АН БССР у падпарадкаванне Міністэрства культуры (1963). Аднаўленне музейнай экспазіцыі да юбілейных дат (1982, 2002). Традыцыя правядзення штогадовага літаратурнага свята «Каласавіны» (1985).

Калекцыі музея – рукапісаў, аўтографаў, кінафотадакументаў, рэчавых помнікаў, асабісты архіў Якуба Коласа, бібліятэка.

Сучасная экспазіцыя музея.

Філіялы музея – Мемарыяльны комплекс Мікалаеўшчына /Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл./: мемарыяльная сядзіба «Смольня» (1967), «Акінчыцкая лясная камора» (1982), мемарыяльная сядзіба «Альбуць» (1990), мемарыяльная сядзіба «Ласток» (1997).

*Тэма 4. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту. Музеі-запаведнікі*

Гісторыя Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

Крытэрыі выбару месца для музея (унікальны геаграфічны ландшафт, помнік геалагічнай гісторыі, памятная гістарычная мясціна). Заснаванне музея (1976).

Кірункі работы па стварэнні музея (выяўленне, збор і ўлік помнікаў, распрацоўка навуковай канцэпцыі, стварэнне праекта генеральнага плана музея на падставе гісторыка-этнаграфічнага раяніравання матэрыяльнай культуры Беларусі). Структурная аснова музея. Сектары – Цэнтральная Беларусь, Падняпроў'е, Паазер'е. «Мястэчка» і «Драўляная гарадская забудова». Правядзенне народных свят на тэрыторыі музея.

Калекцыі музея – помнікаў народнай архітэктуры, у якія ўключаюцца этнаграфічныя экспазіцыі і тэматычныя выставы сельскагаспадарчых прылад працы, прадметаў побыту і вырабаў рамеснікаў.

Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе». Дзейнасць Заслаўскага гісторыка-археалагічнага запаведніка (1967),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» (1986). Рэстаўрацыйныя работы (1967–1990).

Структура музея-запаведніка, асноўныя кірункі дзейнасці, музейныя калекцыі.

Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» (1993).

Структура музея-запаведніка, асноўныя кірункі дзейнасці, музейныя калекцыі.

*Тэма 5. Музеі г. Мінска (знаёмства з музеямі горада)*

Семінарскія заняткі па тэме прадугледжваюць (па выбары) знаёмства і абмеркаванне экспазіцый музеяў, якія з'яўляюцца структурнай часткай адпаведнага дзяржаўнага ведамства ці ўстановы – Музейнага фонду Нацыянальнага Банка Рэспублікі Беларусь, Музея пажарнай і аварыйна-выратавальнай справы Навукова-даследчага інстытута пажарнай бяспекі і пытанняў надзвычайных сітуацый Міністэрства надзвычайных становішчаў Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага музея войск Міністэрства ўнутраных спраў, Музея беларускай чыгункі, Анатамічнага музея пры Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце і інш.

*Тэма 6. Мінскі абласны краязнаўчы музей (г. Маладзечна)*

Сетка дзяржаўных музеяў Мінскай вобл.

Заснаванне Маладзечанскага абласнога музея (1959). Перайменаванне музея ў Мінскі абласны краязнаўчы музей (1964).

Дзейнасць Г. А. Каханоўскага.

Перабудовы экспазіцыі ў 1970–1990-я гг.

Паступленне ў фонды музея матэрыялаў археалагічных даследаванняў Мінскай вобл.

Асноўныя кірункі дзейнасці музея.

Выставачная дзейнасць.

Калекцыі музея – археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, пісьмовых крыніц, керамікі, драўлянай скульптуры, музычных інструментаў, асабістых рэчаў і прыжыццёвых выданняў беларускіх дзеячаў навукі і культуры.

Сучасная экспазіцыя музея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 7. Раённыя музеі Мінскай вобл.*

Семінарскія заняткі па тэме прадугледжваюць знаёмства з музеямі Мінскай вобл. шляхам падрыхтоўкі студэнтамі электронных прэзентацый, якія прадстаўляюць найбольш значныя раённыя музеі вобласці.

## Раздзел II. Дзяржаўныя музеі Брэсцкай вобл.

*Тэма 8. Брэсцкі абласны краязнаўчы музей*

Агляд сеткі дзяржаўных музеяў Брэсцкай вобл.

Заснаванне (1945) і адкрыццё (1957) Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.

Калекцыі музея – археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, мастацкая, старадрукаў і рукапісных кніг, музычных інструментаў, зброі XVI–XVIII стст., мінералаў, горных парод, плакатаў Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, матэрыялаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны.

Музейныя аддзелы – «Камянецкая вежа», музей «Родная прырода», музей «Космас».

Асвятленне ў сучаснай экспазіцыі музея гісторыі края XI–XX стст.

Філіялы музея (былыя і сучасныя) – «Камянецкая вежа» /г. Камянец/ (1969), Музей партызанскай славы ва ўрочышчы Хаваншчына каля в. Карачын /Івацэвіцкі р-н, Брэсцкая вобл./ (1971), Археалагічны музей «Бярэсце» (1972), Музей атэізму /в. Гершоны, Брэсцкі р-н/ (1986), «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» /г. Брэст/ (1998), Музей гісторыі горада Брэста (1990), Мастацкі музей /г. Брэст/ (2000).

*Тэма 9. Раённыя музеі Брэсцкай вобл.*

Семінарскія заняткі па тэме прадугледжваюць знаёмства з музеямі Брэсцкай вобл. шляхам падрыхтоўкі студэнтамі электронных прэзентацый, якія прадстаўляюць найбольш значныя раённыя музеі вобласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Дзяржаўныя музеі Віцебскай вобл.

### *Тэма 10. Віцебскі абласны краязнаўчы музей*

Агляд сеткі дзяржаўных музеяў Віцебскай вобл. Заснаванне і адкрыццё (1918) Віцебскага гісторыка-археалагічнага музея. Стварэнне фондаў музея на базе калекцый А. Р. Брадоўскага, В. П. Федаровіча, збораў Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея, музея Віленскага вайсковага сходу, музея Віцебскай вучонай архіўнай камісіі і інш. Дзейнасць А. Р. Брадоўскага, Я. І. Васілевіча. Перадача музею будынка гарадской ратушы (1924). Стварэнне на базе Віцебскага гісторыка-археалагічнага музея Віцебскага аддзялення БДМ (1924–1928). Музейныя аддзелы ў канцы 1920-х гг. Наданне музею новых назваў – Беларускі дзяржаўны культурна-гістарычны музей (1928), Віцебскі сацыяльна-гістарычны музей (1932). Адкрыццё філіяла музея – Антырэлігійнага музея ў Антоніеўскім касцёле (1940). Спыненне дзейнасці і страты музея падчас Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне дзейнасці музея пад назвай Віцебскі абласны краязнаўчы музей (1944). Стварэнне экспазіцыі музея. Выставачная дзейнасць музея.

Калекцыі музея – археалогіі, нумізматыкі, старадрукаў, зброі, пісьмовых крыніц і фотадакументаў.

Асвятленне ў экспазіцыі музея гісторыі Віцебска IX–XIV стст.

Філіялы музея (былыя і сучасныя) – Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнёва» /Віцебскі р-н/ (1988), Літаратурны музей /г. Віцебск/ (1988), Мастацкі музей /г. Віцебск/ (1992), Музей прыватных калекцый /г. Віцебск/ (1992).

### *Тэма 11. Раённыя музеі Віцебскай вобл.*

Семінарскія заняткі па тэме прадугледжваюць знаёмства з музеямі Віцебскай вобл. шляхам падрыхтоўкі студэнтамі электронных прэзентацый, якія прадстаўляюць найбольш значныя раённыя музеі вобласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IV. Дзяржаўныя музеі Гомельскай вобл.

*Тэма 12. Гомельскі палацава-паркавы ансамбль*

Агляд сеткі дзяржаўных музеяў Гомельскай вобл.

Гісторыя Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Збіральніцкая і калекцыянерская дзейнасць М. П. Румянцава, І. Ф. Паскевіча, Ф. І. Паскевіча.

Заснаванне і адкрыццё мастацка-гістарычнага музея імя А. В. Луначарскага (1919). Стварэнне на базе Гомельскага мастацка-гістарычнага музея імя А. В. Луначарскага Гомельскага аддзялення БДМ (1924–1928). Наданне музею самастойнасці і новай назвы – Беларускі дзяржаўны мастацка-культурны музей (1928). Музейныя аддзелы ў канцы 1920-х гг.

Спыненне дзейнасці і страты музея падчас Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне работы музея пад назвай Музей краязнаўства (1944), Дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей (1945), Гомельскі абласны краязнаўчы музей (1952). Адкрыццё экспазіцыі музея (1946). Экспазіцыйная работа музея ў 1950–1970-я гг. Работа па арганізацыі адкрытага захавання фондаў у аддзеле музея – Палацы Халецкіх (1980) у в. Хальч Веткаўскага р-на. Поўная перадача палаца Паскевічаў-Румянцавых (1996) Гомельскаму абласному краязнаўчаму музею. Адкрыццё мастацкага раздзела экспазіцыі ў «Паляўнічым доміку» (1997). Адкрыццё новай экспазіцыі (2003–2004).

Рэарганізацыя Гомельскага абласнога краязнаўчага музея (2006). Перайменаванне ўстановы «Музей Гомельскі палацава-паркавы ансамбль» у дзяржаўную гісторыка-культурную ўстанову «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль» (2006) і яе склад.

Выставачная дзейнасць музея.

Калекцыі музея – збор прадметаў з калекцыі Паскевічаў, археалогіі, нумізматыкі, сфрагістыкі, фалерыстычная, мастацкая, прыродазнаўчая і інш.

Філіялы музея (былыя) – Мемарыяльны музей імя П. М. Лепяшынскага /в. Ліцвінавічы, Кармянскі р-н/ (1991), сядзібны комплекс Халецкіх /в. Хальч, Веткаўскі р-н/ (1980), Гомельскі абласны музей ваеннай славы (2004).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 13. Раённыя музеі Гомельскай вобл.*

Семінарскія заняткі па тэме прадугледжваюць знаёмства з музеямі Гомельскай вобл. шляхам падрыхтоўкі студэнтамі электронных прэзентацый, якія прадстаўляюць найбольш значныя раённыя музеі вобласці.

## Раздзел V. Дзяржаўныя музеі Гродзенскай вобл.

*Тэма 14. Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей*

Агляд сеткі дзяржаўных музеяў Гродзенскай вобл.

Заснаванне і адкрыццё Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея (1922). Традыцыі музейнай справы ў Гродне (дзейнасць А. Тызенгаўза, Ж. Э. Жылібера, Музей прыроды С. Жыўны). Дзейнасць Ю. Ядкоўскага. Перадача музею Старога замка (1924). Стварэнне новай музейнай экспазіцыі (1939–1941). Спыненне дзейнасці і страты музея падчас Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне работы музея як Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (1945). Дзейнасць музея па камплектаванні фондаў, стварэнні экспазіцыі, папулярызацыі збораў, выхаваўча-асветніцкая дзейнасць.

Калекцыі музея – археалогіі, нумізматыкі, абразоў XVII–XIX стст., «Нёманскае шкло» XIX–XX стст., вайсковага рыштунку, зброі, старадрукаў.

Асвятленне ў экспазіцыі музея гісторыі і культуры Гродзеншчыны, старажытных помнікаў Панямоння і інш.

Размяшчэнне экспазіцыі музея ў Каралеўскім палацы XVI ст. (Старым замку), Каралеўскім палацы XVIII ст. (Новым замку), доме рамесніка XVIII ст. (Музей гісторыі Гараднiцы).

Філіялы музея (былыя і сучасныя): Барысаглебская царква XII ст. /г.Гродна/ (1977), Музей М. Багдановіча /г. Гродна/ (1986), Музей Народнай славы /г. Гродна/, Музей гісторыі Гараднiцы /г. Гродна/ (1994).

*Тэма 15. Раённыя музеі Гродзенскай вобл.*

Семінарскія заняткі па тэме прадугледжваюць знаёмства з музеямі Гродзенскай вобл. шляхам падрыхтоўкі студэнтамі электронных прэзентацый, якія прадстаўляюць найбольш значныя раённыя музеі вобласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел VI. Дзяржаўныя музеі Магілёўскай вобл.

### *Тэма 16. Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава*

Агляд сеткі дзяржаўных музеяў Магілёўскай вобл.

Заснаванне Дзяржаўнага гістарычнага музея пралетарскай культуры (1919) на базе фондаў музея Магілёўскага губернскага статыстычнага камітэта і Магілёўскага царкоўна-археалагічнага музея. Пераўтварэнне музея ў Магілёўскае аддзяленне БДМ (1924–1928). Набыццё музеем самастойнасці і новай назвы – Беларускі Дзяржаўны Акруговы краязнаўчы музей (1928). Музейныя аддзелы ў канцы 1920-х гг. Спыненне дзейнасці і страты музея падчас Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне работы музея як Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея (1944).

Фондавая, экспазіцыйная, навукова-даследчая, навукова-асветніцкая работа музея. Музейны аддзел – Музей этнаграфіі (1991).

Калекцыі музея – археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, прыродазнаўчая, кніг магілёўскай тыпаграфіі XVII–XVIII стст., жывапісу XVIII–XX стст., перыядычнага друку, матэрыялаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Сучасная экспазіцыя музея.

Філіялы музея (былыя і сучасныя) – Музей гісторыі рэлігіі і атэізму (1932), Мемарыяльны музей Г. К. Арджанікідзэ (1937), Музей дзекабрыстаў (1985), Музей бітвы пад Лясной (1958), Этнаграфічны музей Падняпроў’я (1996).

### *Тэма 17. Раённыя музеі Магілёўскай вобл.*

Семінарскія заняткі па тэме прадугледжваюць знаёмства з музеямі Магілёўскай вобл. шляхам падрыхтоўкі студэнтамі электронных прэзентацый, якія прадстаўляюць найбольш значныя раённыя музеі вобласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Беларускія музеі: Гісторыя. Хроніка. Сучаснасць // Музейныя сшыткі: навук.-метад. зб. – Вып. 4 / уклад. А. М. Калбаска. – Мінск : Беларус. ін-т праблем культуры, 1998. – 130 с.

*2. Воронкова, И. Ю.* Создание и становление Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны / И. Ю. Воронкова. – Мінск : Беларусь, 2002. – 82 с.

*3. Гужалоўскі, А. А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі: вучэб.-метад. дапам. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 302 с.

*4. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002. – 176 с.

*5. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1941–1991) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2004. – 218 с.

*6. Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

*7.* Закон Республики Беларусь О музеях и Музейном фонде, 3 июля 2011 г. // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 78, 2/1833.

*8.* Музеі Беларусі: Інфармацыя аб музеях сістэмы Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь / склад.: А. Б. Сташкевіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2001. – 272 с.

*9.* Музеі Беларусі: даведачнае выданне. – Мінск: БелЭн, 2008. – 559 с.

*10. Савіцкі, Г. У.* Гісторыя станаўлення і развіцця Віцебскага абласнога краязнаўчага музея / Г. У. Савіцкі // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30–31 кастр. 2008 г., ВАКМ. – Мінск : Медысот, 2009. – С. 14–24.

*Дадатковая*

*1. Бамбешка, І. І.* Актуалізацыя гісторыка-культурнай спадчыны Віцебшчыны сродкамі краязнаўчых музеяў у 1920–1930-х гг. / І. І. Бамбешка // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 20–21 кастр. 2011 г., ВАКМ. – Мінск, 2013. – С. 106–110.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2.* Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны : путеводитель / подгот. И. Ю. Воронкова. – Минск : Полымя, 1991. – 20 с.

*3.* Веткаўскі музей народнай творчасці. – Мінск : Полымя, 1991. – 28 с.

*4. Касімава, А. В.* Буйныя выставачныя праекты Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі ў пачатку XXI ст. / А. В. Касімава // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30–31 кастр. 2008 г., ВАКМ. – Мінск : Медысот, 2009. – С. 361–371.

*5. Курчицкий, А. В.* Страницы истории Гомельского областного краеведческого музея / А. В. Курчицкий // Краеведческие записки. К 80-летию Гомел. обл. краевед. музея : сб. ст. / Упр. культуры Гомел. облисполкома. [отв. ред. А. И. Дробушевский]. – Гомель, 2000. – С. 17–34.

*6. Лянкевіч, Т.* Мінскі абласны краязнаўчы музей / Т. Лянкевіч // Беларус. гіст. часопіс. – 2001. – № 6. – С. 19–26.

*7.* Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь: стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., 24 лістап. 2011 г. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 143 с.

*8. Несцярчук, Л. М.* Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўн. этапы фарміравання, сучас. стан і перспектывы / Л. М. Несцярчук. – Мінск : Беларус. тэлеграф. агенцтва, 2003. – 283 с.

*9. Царук, В. М.* Экспазіцыйная дзейнасць Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея / В. М. Царук // Краязнаўчыя запіскі / Гродзен. абл. упр. культуры, Гродзен. дзярж. гіст.-археал. музей. – Гродна, 2000. – Вып. 4. – С. 3–11.

*10. Шышкова, І. А.* Музей як сацыяльны інстытут выхавання гістарычнай памяці. Праблемы і перспектывы / І. А. Шышкова // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30–31 кастр. 2008 г., ВАКМ. – Мінск : Медысот, 2009. – С. 297–302.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Вучэбная работа студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі заснавання і дзейнасці беларускіх музеяў.

Найбольш дзейснымі педагагічнымі методыкамі і тэхналогіямі, што накіроўваюць студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, садзейнічаюць набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;
– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, напісанні курсавой і дыпломнай работы па дадзенай дысцыпліне.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з вучэбным планам (рабочыя варыянты). Прадугледжваюцца такія формы, як падрыхтоўка студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, падрыхтоўка прэзентацый, складанне бібліяграфічных спісаў і інш.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас семінарскіх і лекцыйных заняткаў, а таксама ў час правядзення экзамену.

Выкладчык-прадметнік знаёміць студэнтаў са спецыфікай той ці іншай самастойнай работы і спосабамі яе кантролю падчас уводнай лекцыі па вучэбнай дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| Балы | Крытэрыі ацэнкі на экзамене |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адзнака ставіцца студэнту, калі спроба адказу цалкам не адпавядае зместу прапанаваных яму пытанняў |
| 2 (два) | Адзнака ставіцца студэнту, які мае істотныя прабелы ў галіне арганізацыі і гісторыі музеяў Беларусі, не набыў уменняў арыентавацца ў праграмным матэрыяле, не засвоіў большую частку вучэбнага матэрыялу; не арыентуецца ў падзеях музейнага жыцця краіны; прапусціў і не адпрацаваў семінарскія заняткі і не выканаў заданні па самастойнай рабоце |
| 3 (тры) | Адзнака ставіцца студэнту, які валодае праграмным матэрыялам ў аб'ёме, дастатковым для далейшага навучання, здольны вызначыць асноўныя этапы развіцця музейнай справы, аднак вельмі слаба арыентуецца ў падзеях музейнага жыцця Беларусі, у галіне арганізацыі і гісторыі музеяў краіны, мае агульныя ўяўленні аб іх і не ў стане растлумачыць іх сутнасць, не валодае музеязнаўчай тэрміналогіяй, не вызначаўся актыўнасцю і зацікаўленасцю прадметам на семінарскіх занятках, а таксама пры выкананні самастойнай работы, няпоўнасцю адпрацаваў практычныя заняткі, па выніках рубежнага кантролю мае адмоўныя адзнакі |
| 4 (чатыры) | Адзнака ставіцца студэнту, які неглыбока валодае асноўным вучэбным матэрыялам па праграме, неабходным для далейшай вучобы і для работы па спецыяльнасці, слаба арыентуецца ў галіне арганізацыі і гісторыі музеяў замежных краін, слаба засвоіў асноўную літаратуру па праграме і не знаёмы з музейным заканадаўствам; не праявіў актыўнасць на семінарскіх занятках, але атрымаў станоўчую адзнаку за выкананне большасці заданняў практычнага характару; дапускае памылкі ў адказах на экзамене і слаба арыентуецца ў музейна-спецыфічных тэрмінах |
| 5 (пяць) | Заслугоўвае студэнт, які ў асноўным засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, арыентуецца ў галіне арганізацыі і гісторыі музеяў Беларусі, засвоіў большасць матэрыялу па асноўнай музейнай літаратуры, прымаў удзел у семінарскіх занятках і выканаў усе заданні, атрымаўшы станоўчыя адзнакі; асэнсавана пераказвае праграмны матэрыял, але ў адказе на экзаменацыйныя і дадатковыя пытанні дапусціў неістотныя памылкі, не карыстаецца неабходнай музейнай тэрміналогіяй |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 6 (шэсць) | Заслугоўвае студэнт, які поўна ведае вучэбны матэрыял па праграме, асноўныя моманты ў галіне арганізацыі і гісторыі музеяў замежных краін, падзеі гісторыі музейнай справы ў Беларусі, засвоіў большую частку матэрыялу па асноўнай літаратуры, прымаў удзел у семінарскіх занятках і выканаў усе заданні, атрымаўшы станоўчыя адзнакі; асэнсавана пераказвае праграмны матэрыял, але ў адказе на экзаменацыйныя і дадатковыя пытанні дапускае неістотныя памылкі, не карыстаецца неабходнай музейнай тэрміналогіяй |
| 7 (сем) | Заслугоўвае студэнт, які трывала і грунтоўна ведае вучэбны матэрыял па праграме; арыентуецца ў галіне арганізацыі і гісторыі музеяў замежных краін, падзеях музейнага жыцця Беларусі ў розныя перыяды развіцця, засвоіў большасць матэрыялаў з рэкамендаванай літаратуры па дысцыпліне; актыўна працаваў на семінарскіх занятках; своечасова выканаў усе заданні і атрымаў станоўчыя адзнакі, аднак у адказах на экзаменацыйныя і дадатковыя пытанні дапускае нязначныя памылкі, рэдка ўжывае музейна-спецыфічныя тэрміны пры адказах на пытанні |
| 8 (восем) | Заслугоўвае студэнт, які паказаў добрае веданне вучэбнага матэрыялу па праграме і добра арыентуецца ў галіне арганізацыі і гісторыі музеяў Беларусі; засвоіў матэрыял па асноўнай літаратуры, прапанавай у праграме; самастойна і своечасова выканаў усе заданні па самастойнай рабоце па курсе, праявіў актыўнасць на семінарскіх занятках; падчас адказу на экзаменацыйныя і дадатковыя пытанні не дапусціў памылак, матэрыял выкладае без значных парушэнняў, лагічна і паслядоўна, падчас экзамену паказаў добрае валоданне музейна-спецыфічнай тэрміналогіяй; па выніках рубежнага кантролю не мае нездавальняючых адзнак |
| 9 (дзевяць) | Заслугоўвае студэнт, які поўна і сістэмна засвоіў вучэбны матэрыял па праграме дысцыпліны, добра ведае падзеі музейнага жыцця Беларусі ў розныя перыяды гісторыі іх развіцця, арыентуецца ў галіне арганізацыі і гісторыі беларускіх музеяў, глыбока засвоіў асноўную і знаёмы з дадатковай літаратурай, а таксама з заканадаўчымі дакументамі і інструкцыямі, якія рэгламентуюць розныя бакі музейнай дзейнасці; актыўна працаваў на семінарскіх занятках, на высокім узроўні выканаў усе віды заданняў па прадмеце; адказ на экзамене характарызуецца дакладнасцю, матэрыял падае паслядоўна, лагічна, падчас адказу вольна карыстаецца адпаведнымі музейнымі тэрмінамі, па выніках рубежнага кантролю мае выдатныя і добрыя адзнакі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 10 (дзесяць) | Заслугоўвае студэнт, які поўна, глыбока і сістэмна засвоіў вучэбны матэрыял па праграме дысцыпліны, выдатна ведае і арыентуецца ў падзеях музейнага жыцця Беларусі ў розныя перыяды гісторыі іх развіцця, глыбока засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру, а таксама заканадаўчыя дакументы і інструкцыі, якія рэгламентуюць розныя бакі музейнай дзейнасці; творча і актыўна працаваў на семінарскіх занятках, самастойна і на высокім узроўні выканаў усе віды заданняў па прадмеце; адказ на экзамене характарызуецца дакладнасцю, падчас адказу самастойна аналізуе матэрыял, падае яго на экзамене паслядоўна, лагічна і дакладна, вольна карыстаецца адпаведнымі музейнымі тэрмінамі, па выніках рубежнага кантролю мае выдатныя і добрыя адзнакі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МУЗЕІ СВЕТУ. Раздзел 2. МУЗЕІ БЕЛАРУСІ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,96. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.